

Возера Святое

рел» – выток, вусце, гарлавіна. Вякамі возера назапашвала розныя арганічныя рэчывы, якія вялікім пластом засцілаюць дно і з'яўляюцца каштоўным арганічным угнаеннем. Гэта сапрапелі. Прывольна адчувала сябе тут рыба, якой раней было шмат. Размешчана на Чашніцкай раўніне, берагі возера нізінныя, топкія, на 38 % зараслі лесам і хмызняком. Каля возера – катлавіна з залежамі торфу. Да берага возера прымыкае балота, у якім растуць брусніцы і журавіны.

Баярскае возера падобнае да Жэрынскага. Знаходзіцца каля в. Баяры. Назвы возера і вёскі паходзяць ад слова баяры – сацыяльная група насельніцтва XIII – XVIII стст. У адрозненне ад Жэрынскага возера, у якім водзіцца ў асноўным белы карась, у Баярскім – карась чырвоны. Мясцовыя жыхары ловяць яго «на бурбалку». Спосаб лоўлі просты. Рыбак едзе па возеры на лодцы і высочвае месца. Там, дзе ў ілістае дно «зашываецца» карась, уздымаюцца бурбалкі балотнага газу. Туды рыбак апускае сачок і падчэплівае, калі пашанцуе, разам з ілам і карася, які «выдаў» сваё месцазнаходжанне.

Вялікай колькасцю азёр славяцца землі саўгаса «Чарэя». Тут цэлы ланцуг азёр. Асабліва прыгожым з'яўляецца воз. Чарэйскае – старажытная назва Галаўль.

Прыгажосцю славіцца Раманоўскае возера, да якога прымыкае лясное ўрочышча – заказнік «Круш». Возера амаль круглае, берагі яго балоцістыя, параслі лесам. Але ў адным месцы бераг пясчаны, узвышаны. Дно ў тым месцы павольна паглыбляецца і ўтварае цудоўны пляж. Берагі параслі травамі, ёсць шмат лекавых. Назва Раманоўскага возера паходзіць ад імя Раман.

Святое возера. Легенда кажа, што калісьці тут стаяла царква. Аднойчы, калі ў храме ішла служба, яна разам з людзьмі правалілася, і на тым месцы